# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## IV клас*

***Унізе.***

*1. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

[в] [у] [е]

[..]ніз[..]

*2. Знайдзіце словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове, і запішыце іх.*

унізе ____________________________________

*3. Дапішыце антонімы да прапанаваных слоў.*

Уверсе — _____________

Уверх — ______________

Верх — _______________

*Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі:*

Людзі назіраюць за парадам войск. _______ ляцяць самалёты і верталёты. ________ едуць танкі і самаходныя машыны.

*Выдзеліце канчаткі дзеясловаў. Вызначыце іх час, лік, асобу, тып спражэння.*

*4. Дапоўніце верш слоўнікавым словам:*

**На вясёлкавых арэлях**

Адгрымела навальніца,  
лёгка дыхае зямля,  
і вясёлка-чараўніца  
падміргнула мне здаля.

Вышынёю захварэў я,  
і, нібы ў дзівосным сне,  
на гары крутой арэлі  
гушкаць пачалі мяне.

Ой, лячу я! Прамільгнулі  
_________ рэчка, луг ды лес.  
Не гукай мяне, матуля,  
каб хутчэй з вясёлкі злез.

*(Жанна Усцінава* [1, с. 35]*)*

*Знайдзіце ў вершы дзеяслоў у неазначальнай форме і падкрэсліце яго.*

*6. Сярод прапанаваных слоў знайдзіце і закрэсліце лішняе.*

Унізе, нізка, невысока, уніз.

*Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.*

*Дапоўніце загадку словам, якое падыходзіць па сэнсе.*

Расце ________ галавою. [я] [з]  
І нараджаецца, [я] [ш]  
І памірае [л]  
Вясною. [д]

*(Міхась Пазнякоў* [2, с. 188]*)*

*Злучыце «рассыпаныя» літары, каб атрымалася слова-адгадка.*

*Знайдзіце ў загадцы дзеясловы, вызначыце іх час.*

***Да пабачэння.***

*1. «Рассыпаныя» літары злучыце так, каб атрымаўся выраз, якім людзі карыстаюцца пры развітанні.*

**д а ч э н**  
**п**  
**а б а н я**

*2. Дапоўніце кожны радок ветлівых слоў уласным прыкладам.*

а) Усяго добрага, да сустрэчы, бывайце здаровы, _______________.

б) Добрай раніцы, прывітанне, добры вечар, _______________.

*3. Дапоўніце сказы патрэбнымі ветлівымі словамі.*

Пры развітанні мы гаворым сябрам і знаёмым «д_ _____________».

Раніцай мы вітаем адзін аднаго словамі «д_____ ____________».

*Выдзеліце канчаткі дзеясловаў. Вызначыце, у якой форме часу, асобы і ліку яны ўжыты. Падкрэсліце дзеяслоў другога спражэння.*

***Подпіс.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 4 | 3 | 5 | 1 | 6 |
| о | п | д | і | п | с |

*Пастаўце націск у слове.*

*2. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

Прозвішча, напісанае ўласнаручна пад якім-небудзь тэкстам, малюнкам, карцінай для пацвярджэння свайго аўтарства або згоды з чым-небудзь, — гэта ___________.

Той, хто падпісаўся на якое-небудзь друкаванае выданне, — гэта ___________.

Паставіць подпіс для пацвярджэння, пасведчання чаго-небудзь — гэта значыць ___________.

***Словы для даведкі:*** падпісчык, падпісаць, подпіс.

*3. У радзе літар знайдзіце і абвядзіце слоўнікавыя словы.*

ПОДПІСЕКУНДАХВОТНА

*4. Сярод прапанаваных слоў знайдзіце і закрэсліце лішняе слова.*

Подпіс, выпісаць, пісьменнік, падпіліць, пісьмо, падпісаць, падпісчык.

*Абазначце корань у аднакаранёвых словах.*

*5. Утварыце словы па ўзоры. Выдзеліце ў іх корань.*

Запісаць — *запіс,* падпісаць — ________, надпісаць — ________, перапісаць — ________.

*Дапоўніце сказы патрэбнымі назоўнікамі.*

---

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

а) Ты зробіш кароткі ______ у блакноце. б) Настаўніца паставіць свой ________ у дзённіку. в) У Беларусі пройдзе ________ насельніцтва. г) Вучоныя вывучаюць старажытны ________ на камені.

*Знайдзіце ў сказах деясловы. Выдзеліце іх канчаткі. Вызначыце час, асобу, лік, тып спражэння дзеясловаў.*

***Меншы.***

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія.*

М Й Е Й Н Й Ш Й Ы

*Запішыце слова, якое атрымалася. Падкрэсліце ў слове літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі.*

*2. Дапішыце антонімы да прапанаваных слоў.*

Большы — ___________

Большасць — ___________

Больш — ___________

*Дапоўніце сказы запісанымі словамі:*

а) Сяргейка ______________ за брацiка на тры гады. б) Калі вы будзеце ўважлівымі, то зробіце ______________ памылак. в) Людзей, якія любяць зіму з моцнымі маразамі, ____________.

*Выдзеліце канчаткі дзеясловаў. Вызначыце іх час, лік, асобу, тып спражэння.*

*3. Дапоўніце задачку на кемлівасць слоўнікавым словам і рашыце яе.*

*Знайдзіце ў загадцы антонімы, абвядзіце іх.*

Букет з ружовых астраў большы, чым з барвовых,
ды м__________ ён памерам, чым з ліловых.
Падумаем давайце ўсе як след
І вызначым найбольшы тут букет.

*(Соф'я Шах* [3, с. 72])

*Які букет самы вялікі? Зафарбуйце правільны адказ.*

| букет з ружовых астраў | букет з барвовых астраў | букет з ліловых астраў |
|---|---|---|

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Маст. літ., 2012. — 279 с., іл.
2. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / Міхась Пазнякоў ; маст. Марыся Лось. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
3. *Шах, С. М.* Вучым гаварыць і думаць : вучэб.-метад. дапаможнік для лагапедаў / С. М. Шах. — Мінск : Народная асвета, 1998. — 95 с.



***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*


# Літаратурнае чытанне. IV клас

## Метадычныя каментарыі да ўрокаў

### Урок 27. Кастусь Цвірка «У кнігарні»

***Задачы:*** фарміраваць правільнае вымаўленне спалучэння зычных гукаў пры чытанні; узбагачаць лексіку вучняў словамі верша; прадоўжыць фарміраванне ў чацвёртакласнікаў вобразных уяўленняў па праблеме захавання і развіцця беларускай мовы ў Рэспубліцы Беларусь сродкамі мастацкага слова; развіваць чытацкія ўменні характарызаваць герояў мастацкага твора на аснове іх выказванняў, вызначаць аўтарскія і выказваць уласныя адносіны да ўчынкаў і слоў герояў; вызначаць галоўную думку верша; фарміраваць інтанацыйныя ўменні выразнага чытання твора; выхоўваць па-[illegible] патрэбы гаварыць па-беларуску і

**Праверка дамашняга задання.**

**Маўленчая размінка.** Ажыццяўляецца па ўрыўку з верша Петруся Макаля «Родная мова» (с. 93). Пасля ўзорнага настаўніцкага чытання адзначаных вядомых гукаў у паэтычных радках трэба засяродзіць увагу вучняў на вымаўленні слоў са спалучэннямі літар ***тч*** і ***дч***. Для разумення фанетычных асаблівасцей беларускай мовы можна на дошцы праілюстраваць яшчэ некалькі падобных слоў з неадпаведнасцю вымаўлення і напісання: *лё**тч**ык* [чч], *спа**дч**ына* [чч], *на рэ**чц**ы* [цц], *на кла**дц**ы* [цц], *у пала**тц**ы* [цц].

Адказы на пытанні. Чаму Пятрусь Макаль называе беларускую мову матчынай? *(Таму што на гэтай мове гаварыла яго маці, якая навучыла і прывіла любоў да беларускага слова і свайму сыну.)* З чым параўнаў паэт сваё пазнанне матчынай мовы? Пра-[illegible] адпаведныя радкі. (Адказам з'яўляюцца